Гродна, 25.04.2024

№123/24

**Паведамленне пра біскупскае пасвячэнне**
**наміната Уладзіміра Гуляя, біскупа-каад'ютара**

Шаноўныя святары, законныя айцы і сёстры,
Улюбёныя браты і сёстры, вернікі Гродзенскай дыяцэзіі!

З радасцю паведамляю вам, што 25 мая, у суботу, у гродзенскай катэдры святога Францішка Ксаверыя на святой Імшы ў 12.00 адбудзецца біскупскае пасвячэнне наміната Уладзіміра Гуляя, біскупа-каад'ютара.

У сувязі з гэтай важнай для нашай дыяцэзіі падзеяй хачу запрасіць усіх вас на святую Імшу, падчас якой адбудзецца пасвячэнне. Ад імя біскупа-наміната прашу аб прысутнасці і малітве ў яго інтэнцыях.

Намінат прыме пасвячэнне з рук арцыбіскупа Антэ Ёзіча, Апостальскага нунцыя ў Беларусі, і распачне служэнне ў якасці біскупа-каад'ютара Гродзенскай дыяцэзіі.

Ахінем шаноўнага наміната нашай малітвай! Няхай шчодрасць Божай ласкі спадарожнічае яму ў падрыхтоўцы да прыняцця пасвячэння і ў далейшым служэнні.

З усяго сэрца ўсіх благаслаўляю.

Аляксандр Кашкевіч
Біскуп Гродзенскі

---

**Пробашчаў і адміністратараў парафій прашу прачытаць гэтае паведамленне ў найбліжэйшую пасля яго атрымання нядзелю на ўсіх святых Імшах.**